

# Таццяна ЯЦУК

Нарадзілася 19 сакавіка 1963 года ў вёсцы Радагошча Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1980 годзе закончыла Валеўскую сярэднюю школу. У гэтым жа годзе паступіла на філалагічны факультэт БДУ, які закончыла ў 1985 годзе. У час вучобы наведвала літаратурнае аб' яднанне "Узлёт", якім кіраваў Алег Антонавіч Лойка, друкавалася ў студэнцкай газеце "Беларускі ўніверсітэт". Працавала на Барысаўшчыне. З 1988 года жыве ў горадзе Баранавічы, працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры.

У 1977 годзе ўдзельнічала ў дзіцячым літаратурным конкурсе "Зоры кастрычніка ", які праводзіўся рэспубліканскай газетай "Піянер Беларусі", была пераможцай гэтага конкурса.

Друкавалася ў калектыўных зборніках "Вусны", "Ліра", "Крыніца дабрыні "Сила слова", міжнародных зборніках "Память храним", "Созвездие", "Ступени", Бессмертный взвод, "Две сестры", літаратурных альманахах "Жырандоля", "Новы замак", часопісе "Буся", "Настаўніцкай газеце", "Заря", у раённых перыядычных выданнях.

Аўтар зборнікаў паэзіі "Груша над абрывам" (2017), "Маладосць на выданні", (2017), "Валошкавыя сны"(2018 ), "Паэма блукання і веры"(2019), "Бліскавіцы над Свіцяззю"(2019), "Алфавітная музыка слоў"(2020), "За сіняй птушкай" (2020), Споведзь чыстаму лісту"(2020), "Случайный дождь" (2021), вершаванай казкі для дзяцей "Прыгоды лесавічка Імшарыка і яго сяброў"(2021), кнігі вершаў для дзяцей "З паклонам да сонейка".(2021)

Сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі, Член Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў (МАПП), кіраўнік літаратурнага аб'яднання "Купальскія зоры" пры Баранавіцкай цэнтральнай бібліятэцы.

# За сіняй птушкай

Жыццё віхурыць у людской гурбе,
І нешта час увесь мудрыць прырода.
Я падарую плынь гадоў журбе,
А плынь удач я падарую роду.

З жыццём зрадніцца сталых думак рой,
Турботна будзе стукаць навальніца,
А я бягу туды, дзе неспакой,
Яму няспынна ўсё жыццё маліцца.

Чаго чакаць на сцішанай шашы,
Жыццё расправіла раптоўна крылле.
На ўзбочыне пачуццяў-- ледзяшы,
І тройка вараных ад спешкі ў мыле.

І дні ўсе вартыя, і час пры мне,
Калі патрэбна ўжо збіраць каменне.
На пажыццёвай глыбе- валуне
Надзейна ўмацавалася карэнне.

Прыспешваць час не буду нікалі,
Хоць круцяцца жыцця майго вяртушкі.
І сёння я на ўзмыленым кані
Ганюся за далёкай сіняй птушкай.

# Ноч, альтанка і споведзь вачэй

Ноч. Альтанка. Анёлава крылле.
Песціць змрок маладую вясну.
Вось яна, яго зорка, Марыля.
Час сустрэчы іх не прамінуў.

За паўкрока ад шчасця і раю,
На забытых шляхоў дзірване,
Бэз гайдаў маладыя іх маі
Там, у той самай юнай вясне.

І не важна, што будзе праз леты
У палоне жыццёвых завей…
Сёння ж -- вечар, альтанка, санеты
І пяшчотная зорнасць вачэй.

Вусны потым прашэпчуць: “Як мала
Лёс нам светлых сустрэч дараваў!”

Споведзь чыстай душы: “Я кахала!”
Сэрца шчыры  адказ: “Я кахаў!”

Цішыня. Бы анёлава крылле,
Завіхурыць барвы ліставей,
І закружыцца ў шчасці Марыля,
Ноч, альтанка і споведзь вачэй.

## Размова з буслам

Не магу ніяк я  прымірыцца,
Што імкліва так гады ляцяць.
Вёска сніцца, даўняя капліца,
Неўгамонная пяе крыніца,
І гайдае думкі рэчкі гладзь.

Здзірванелі сцежкі і палеткі,
Выжывае двор з апошніх сіл,
На ўзмежку рдзее дзівасіл.
Дзеці не прыедуць у адведкі --
Толькі на Дзяды і да магіл.

Справы, вечар песціць адзінота,
Хлеў скрывіўся, працякае дах,
Васількі сумуюць у жытах.
У бусла адвечная турбота:
Як штогод, гняздо будуе птах.

Ён, напэўна, спадзяецца, верыць,
Што счакае запусцелы двор,
Як з даўнейшых незабыўных пор:
Хтосьці зменіць скрыўленыя дзверы,
І падкова, бы нямы дакор,

Заблішчыць ля ўваходу ў хату
Ды ўсцешыць сонныя двары.
Загучыць гамонка дзетвары.
Хто ў тым сягоння вінаваты,
Што старэюць вёскі без пары?

Што ж ты , бусел, так клякочаш смела?
Бо не можаш гневу ты суняць?
І не можаш лёсу даравацць?
Тых мо асуджаеш ты няўмелых,
Не маглі што моладзь утрымаць?

Ты іх не судзі занадта строга:
Час мяняе свой прывычны ход
І віруе думак карагод.
Можа, іх жыццёвая дарога
Прывядзе пад гэты чэзлы плот.

І, магчыма, мой унук дарослы,
Звыкла ўзяўшы ў рукі малаток,
Змераўшы прадзедаўскі масток,
Стукам гучным ранак стрэне росны
І ажывіць прашчураў куток.

І тады твае нашчадкі, бусел,
Як у мой дзіцячы час было ,
Адбудуюць даўняе жытло,
Будуць славіць вёскі Беларусі,
Людзям дараваць сваё цяпло.

А пакуль…Ты ж мудры і дарослы,
Лёс наканаваў табе, сябрук,
Пульс эпохі чуць і  сэрцаў стук,
Будаваць гняздоўі, ладзіць вёсны.
І чакай, хай падрастае ўнук!

## Жыве народ

Праз поле напрасткі
Да лекавых крыніц.
Бягуць, бягуць вякі,
Гады спадаюць ніц.

Мяняюцца брады,
Рэк ажывае ход.
Змаўкаюць гарады,
Але жыве народ.

Праз тоўшчу перашкод
Пад звонкі лістапад
У залежах нягод
Усё ж квітнее сад.

Сінеюць васількі
У полі за сялом.
Палоніць гладзь ракі
І лёс бароніць дом.

## Беларусам

Не разумеюць людзі, што пасля,
У зводах стратасферы нікне  поўня,
А стомленая родная зямля
Яшчэ былых пажараў гора помніць.

Краіна ў цемры, на душы туга,
Вужакай шэрай злосць залезла ў душы.
Там, дзе цяпло, -- нязвыклая смуга
Людскія лёсы неадступна рушыць.

Як лёгка быць дарадцам і суддзёй,
Як цяжка адшукаць у хлусе выйсце,
Калі спакой на нітачцы адной
І ўсё часцей вяртаешся ў калісьці.

І што ні крок--  не шлях, а раздарожжа,
Зноў выбар вызначае зрок і слых.
Так неабходна час на шлях памножыць
І розум прылічыць у лік святых.

Ёсць крыкуны, пантоўшчыкі. Малюся,
Каб Бог не кінуў роднае зямлі.
І на палетках любай Беларусі
Рамонкі праўдай веры зацвілі.

Нам не патрэбны ні Літва, ні прусы,
І Польшча з агалцелаю хлуснёй,
Мы, толькі мы, павінны, -- беларусы
Развеяць хмары над сваёй зямлёй.

Каб годна і ад Гомеля  да Брэста
Спагадаю расквецiць родны край,
Каб праўда чыстай кропляй уваскрэсла,
Там, дзе пануе крыўда і адчай.

Здранцвелай цішынёй правiць роздум
Ды ахінае ноч сваім крылом.
І толькі розум, чалавечы розум
Хай будзе самым важным змагаром.

Мае сябры. Прашу вас, беларусы,
Падумайце і запавольце крок.
Не прамяняйце родны край на хлусы.
Гісторыя зноў ладзіць свой урок.

# Радзіме

Пялёсткі васількоў, карункі жыта.
Мая зямля! Якая прыгажосць!
Зачараваны воблачкі блакітам,
На небасхіле месяц – ночы госць.

Усё маё любімае да болю,
Рамонкі ціха шэпчуцца ў лугах.
І я ўсміхаюся сабе міжволі,
Праменіць радасць сонца ў мурагах.

Крынічка заіскрылася спагадай,
Крышталь яе іскрынак – эліксір.
Чароўны водар дзедавага саду
Ды спадзяванняў і пачуццяў вір.

У паднябессі зоркі ярка свецяць,
Адна з іх – мой жыццёвы талісман.
Таемны перашэпт над рэчкай веццяў,
Як думкі, лугам сцелецца туман.

Высозны дуб галіны ўшыр раскінуў,
Даверу спадзяванні марам-снам.
Хачу запэўніць, што сваю Радзіму
Нікому і ніколі не аддам.

# Яблыкі ў расе

У маладых лясах гасцюе восень,
Мядамі пахнуць спелыя сады.
Гаючы водар туманы разносяць
Па вёсцы, як няўмольныя гады.

Не наталіцца водарам духмяным,
Тут залатыя яблыкаў дажджы.
Над вёскай ціха выспявае ранак
У нетрах сумнай восеньскай імжы.

Дашле прырода велічную згадку,
Як напамін, што на ўсё свой час.
Засыпле залатой лістотай кладку,
Лістоты нафарбуе пра запас.

А восень веліч пакрысе губляе
І горда крыж свой па жыцці нясе.

Хто нараджаецца, той памірае…
Гарацць шматкроп'ем яблыкі ў расе.

## Ліст у калісьці

Я табе не пісала,
Што дождж барабаніў па лісці
І што сум барабаніў па скронях, як дождж.
Я пішу табе ліст у сваё дарагое калісьці.
Ты прыедзеш --
На крок ад маршруту здарож.
Бачыш: вырас наш клён,
Восень грэецца ў барве лістоты,
А ў сэрцы тваім
Ці гарыць хоць іскрынка цяпла?
Мне здаецца,
Што там, у цішы, каля нашага плота,
Мая шчырасць і светласць навек адышла.
І ўжо не ўваскрэсне, магчыма, ніколі,
І ўжо адбалела
І,здасца, зусім не баліць.
Супраць волі свае, супраць цвёрдае волі
Адкахала цябе, адасніла,
Хоць сэрца шчыміць.
Ты здарож на сцяжынку маю
Для сябе нечакана.
Там не знойдзеш мяне ў пустаце,
Дзе вятрыска пяе.
Голас ціха пакліча тужліва ў барве:"Каханы!"
І лістота, як птушка,
Зляціць у далоні твае.

## Не дайсці

Пяць  хвілін без цябе—
І яны адгукаюцца вечнасцю.
Дождж па шыбе шкрабе
З неспатольнай сваёю сардэчнасцю.

Без цябе пяць хвілін
Адгукнуцца трывогай няпрошанай.
Успамін, успамін…
Песціць радасцю светла-ўстрывожанай.

Непапраўны прасвет
Прысудзілі нам вёсны няўмольныя.

Напісалі санет
Самы шчыры мяцеліцы вольныя.

Не згубіць, не знайсці,
Далеч белым сняжком запарошана.
І туды не дайсці,
Дзе гучыць:”Ты такая харошая!”

# Маршрут

**М**аршрут бясконцых нечаканых трас
**М**арзянкай адбівае мары ў скронях.
**М**аркоціць, захапляе сотняй фраз,
**М**армураванай роўняддзю палоніць.

**М**агнітам цягне невядомы шлях,
**М**аністы сыпле на счарсцвелы ранак,
**М**ігаюць ярка зорачкі ў стагах,
**М**аладзічок узыдзе закаханы.

**М**анеўрана маршрут жыцця бяжыць,
**М**аторыць за далёкім паваротам,
**М**арозіць памяць там, дзе прага жыць,
**М**уштруе час, адкладвае на потым…

**М**аўчыць на зачарованай мяжы,
**М**атэматычна разлічыўшы лёсы.
**М**ахнуць крылом на ўзлёце міражы —
**М**аўчком наступны крок мне шлюць нябёсы.

**М**іжвольна шлях я свой, як дар, прыму,
**М**ігалкай прабягуць хвіліны, даты.
**М**іжродны пращчур клікне ў сіняву,
**М**аршрут начэрціць і палічыць страты.

# Забарона

**З**абараніла я цябе кахаць,
**З**авоблачныя сховы змайстравала.
**З**ніякавела раптам сенажаць.
**З**аблыталася думка і растала.

**З**аспакаенне, быццам ціхі снег,
**З**авінавацілася сціпла ў скронях.
**З**агадкай далі назбіралі мех,
**З**нявечанасць упала мне ў далоні.

**З**агойдаліся дрэвы і кусты,
**З**атрапятаўся лісцік адзінокі,
**З**ашалясцелі ў роспачы кусты,
**З**асмучана заплакалі аблокі.

**З**давалася, жыццё згубіла сэнс,
**З**агульна вецер шастаў агалцелы.
**З**бавенню ад кахання ў супрацьвес
**З**ямля знямела ўміг і апусцела.

**З**абыцца б мне і ціха памаўчаць,
**З**маніць сабе, зноў у падман паверыць.
**З**абараніла я цябе кахаць —
**З**маглося сэрца ад пакуты шэрай.

## Прырэчны перазвон

**П**ампезна-проста пракрычыць пугач,
**П**адкажа перайначаныя планы.
**П**рарэжацца прывычнае «паплач!»,
**П**якельнай прыкрасцю прадыктавана.

**П**рыцішыцца прырэчны перазвон.
**П**рынізяцца прывольныя прасторы.
**П**рыўзнімецца прывычна парасон
**П**рыкрые пасмаў прыткіх пераборы.

**П**рачнецца памяць, прошлае прысніць,
**П**еравяслуюць пераможна поры.
**П**ад прыцішэлы поступ перуніц
**П**рамудрасці падымецца прыгорак.

## Ода сям'і

Я супраць моды дзіўнае мужчын
У шлюбе праз гады мяняць жанчын.
І новая абранніца павінна
Быць маладзейшай аж на палавіну.
А, можа, на дзве трэція! Знаходка!
Мяркуюць, калі так, то шчасця лодка
Перавяслуе ўсе азёры, моры,
Мыжчына той забудзецца пра гора.
Сцвярджаюць: маладуха і без мэты
Паедзе з ім любым кірункам свету.
І статуснасць прыдасць, і будзе фонам
Усім яго няпісаным законам.

Паможа бізнес да вяршынь узвысіць –
Для маладосці ёсць нямала місій.
Ды толькі час сцвярджае вельмі смела,
Што маладосць ад грошай ашалела.
Мне так шкада, не дбаюць мужыкі:
Жанчыну ж абіраюць на вякі.
А маладосці трэба ведаць меру:
Які там толк у сталым кавалеры?
Ці з састарэлымі патрэбны шлюбы,
Калі з-за грошай жа яны і любы.
І найважнейшая ў дзяўчыны мэта
Аб’ездзіць з ім, з уроствавым, паўсвету.
Канешне, з правіл ёсць і выключэнне,
Ды рэдкія на нашае здзіўленне.

Я за сям’ю і за яе стасункі,
Якія, быццам лёсу пачастункі.
Павінна ўсё ісці сваім законам:
Вяселле, марш жаданы Мельдінсона.
А маладога толькі малады
І любіць, і шануе праз гады.
І хіба гэта не закон жыццёвы:
Спрадвеку шчасця берагчы  асновы.
Заўсёды разам, бачыць светлы сон,
І плакаць, і смяяцца ва ўнісон.
Усмешкай захапляца немаўляці
І шчасце будаваць ва ўласнай хаце.
Дзяцей выхоўваць, ад удач хмялець
І поруч з жонкай праз гады старэць.
Няхай не ідэальная натура
І не зусім прывабная фігура.
Ды ёсць асноўнае, у значнай меры:
Каштоўнасць неацэннага даверу.
І дзеці там, унукі,сябрукі.
І кладачка за вёскай ля ракі.
І ранкі з незабыўнай цеплынёю,
І вечары з лірычнаю тугою.
І дожджыку пяшчота- грыбасейнасць,
А самае галоўнае – надзейнасць.
Лёс на дваіх, бо разам здабывалі,
А ў росным ранку ружы расцвіталі.
Трывалі зімы і спялілі вёсны,
Пакуль на шлях упаў узрост дарослы.
Як перад Богам у жыццёвым моры
Рука ў руцэ і ў радасці, і ў горы.
Што можа быць за гэта даражэй?
Ляпіце ж шчасце з веры і надзей,

Дзе з маладосці самай ты і я,
І дзеці нашы – моцная сям’я.

## Пялёсткі мяцеліцы

Развяснiўся май, развяснiўся,
Ну, а ты нечакана прыснiўся.
Там, у светласці небасхілу,
Ты, напэўна, пазычыў сiлы,
Раптам спраўдзiўся нечакана.
Зоркі ціха пяшчоцілі ранак,
Незабудкі ўзышлі ля крыніцы.
Трэба ж, столькі гадоў не сніцца.
Груша квеценню там, на ўзмежку,
Занявесціла тваю сцежку,
І пялёсткі чысцюткай мяцеліцы
Паміж намі загадкава сцелюцца.
Я распесціла цябе мроямі,
Незабыты і заспакоены.
Можа там, з непапраўнай турботаю
Ты пакутуеш адзінотаю.
Можа, молішся там употай
З нерастрачанаю пяшчотай.
І, напэўна, сумуеш шчыра,
Што свой ранак жыццё згубіла.
І плывуць журавы над хатаю
Вінавата-невінаватыя.
А за вёскаю, за аселіцай
Белы кіпень чаромхі мяцеліцца.
Неба яркімі аксамітамі
Поіць памяць маю. Ці забытае?
Не забытае, не спазнанае,
На ўсё я жыццё  закаханая.
Праплываюць снягі над вёскай –
Белы вэлюм самотных пялёсткаў.

## Споведзь чыстаму лісту

Бялюткі ліст, ты сябар мой і брат,
Табе я спавядаюся адкрыта.
Імкнуцца думкі ў аксаміт блакіту.
Бялюткі ліст, ты сябар мне і брат.
Мая душа пяшчотаю спавіта.
Калі ж палоніць сэрца снегапад,
Бялюткі ліст, ты сябар мой і брат,
Табе я спавядаюся адкрыта.

# Святыя законы

Святыя ёсць законы на зямлі:
Любіць Радзіму, шанаваць, як маці.
Атаясамліваю два паняцці.
Святыя ёсць законы на зямлі.
Не дай Вам Бог святыні тыя страціць,
Яны ж у сэрцы шчасцем прараслі.
Святыя ёсць законы на зямлі:
Любіць Радзіму, шанаваць, як маці.

Ад Белай Русі
Валошкі даравалі сінь вачэй,
А русасць валасоў ад Белай Русі.
Мой край, тваёй красою наталюся,
Валошкі даравалі сінь вачэй.
Зямля мая, у самай цяжкай скрусе
Я васілёк прыцісну да грудзей.
Валошкі даравалі сінь вачэй,
А русасць валасоў ад Белай Русі

З усіх шляхоў
З усіх шляхоў тваіх збяру тугу,
Каб ты ўздыхнуць мог вольна на ўсе грудзі.
Няхай мяне за рабства ўсе асудзяць.
З усіх дарог тваіх збяру тугу.
І так было, і так нязменна будзе.
Жыцця законы ў сэрцы берагу.
З усіх шляхоў тваіх збяру тугу,
Каб ты ўздыхнуць мог вольна на ўсе грудзі.

# Лірыка душы

Аблятаюць сады, наліваюцца хмары журбою.
Развітаўшыся, зноў я іду да цябе.
Пахнуць травы крыштальнай расой маладою,
І палошчуцца зоркі ў звонкай журбе.

Гэты спелы рамонкавы ранак заспаны
Я табе падару, як надзею збалелай душы.
І, магчыма, тады так у зорны сусвет закаханы.
Ты заўважыш, як бомы звіняць у цішы.

Ты пачуеш, як звонка пяюць і як плачуць нябёсы,
Ты адчуеш, як спелымі грушамі пахнуць сады.
Мы заключым кантракт з незадачлівым лёсам,

І абуджаны месяц ізноў зацвіце малады.

Позна так зацвіце: бачыш хіляцца долу рабіны,
Бачыш плача наўзрыд пераспелай антонаўкай сад.
Ты прыснішся мне самым святым і адзіным.
Што ж спазніўся ты так, залаты заркапад?

